**В.М.Бігеза**, *дацэнт*

# АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Асноўная задача вышэйшай школы на сучасным этапе – забяспечыць падрыхтоўку спецыялістаў высокай кваліфікацыі, здольных папаўняць свае веды ў сістэме шматузроўневай прафесійнай адукацыі, сфарміраваць у студэнтаў патрэбнасць у пастаяннай інтэлектуальнай працы. Для вырашэння названай задачы вельмі важна актывізаваць самастойную работу будучых спецыялістаў пад кіраўніцтвам выкладчыка.

Праблеме арганізацыі самастойнай работы студэнтаў прысвечаны шматлікія педагагічныя даследаванні шэрага навукоўцаў (С.І.Архангельскі, С.М.Васілеўскі, І.П.Гапонаў, М.Р.Га-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

руноў, Я.Д.Грыгаровіч, С.І.Зіноўеў, Н.Д.Іванова, І.Л.Навумчанка, П.І.Підкасісты, У.А.Сласцёнін, І.І.Цыркун і інш.). Сёння ў педагогіцы вышэйшай школы самастойная работа студэнтаў разглядаецца як састаўная частка вучэбна-прафесійнай дзейнасці, якая мае адпаведную матывацыю, прадмет і механізм рэалізацыі. У дадзенай публікацыі мы паспрабуем разгледзець змест і асаблівасці арганізацыі самастойнай работы студэнтаў у сферы падрыхтоўкі бібліятэчнага спецыяліста па рабоце з дзецьмі ў рамках факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый (ФІДК) Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.

Прафесіяналізм студэнтаў у многім залежыць ад іх прафесійнай накіраванасці, адпаведнасці інтарэсаў і здольнасцей. Прафесійная падрыхтоўка студэнтаў спецыялізацыі "бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і юнацтва" мае шэраг асаблівасцей у параўнанні з іншымі спецыялізацыямі. Яны павінны авалодаць тэорыяй і практыкай выхавання, ведаць асаблівасці псіхолага-педагагічнага развіцця дзіцяці, псіхалогію зносін, псіхолага-педагагічнае ўздзеянне кніг і чытання на чытача і інш. Таму вучэбны працэс павінен прадугледжваць інтэграцыю выкладання псіхолага-педагагічных, агульнагуманітарных і спецыяльных дысцыплін. На падставе вышэйсказанага мы лічым мэтазгодным самастойную работу студэнтаў арганізаваць у выглядзе сістэмы комплексных вучэбна-прафесіянальных заданняў. Такі падыход садзейнічае мадэліраванню рэальнай прафесійнай дзейнасці, у якой спалучаюцца веды розных дысцыплін. Менавіта ў такой сістэме самастойнай работы студэнтаў ствараюцца ўмовы для выкарыстання інфармацыйна-дзейнаснага падыходу, які на практычным узроўні можа быць прадстаўлены ў выглядзе сістэмы тэарэтычных і практычных заданняў. Прыкладам могуць служыць комплексныя міжпрадметныя заданні па самастойнай рабоце для студэнтаў, якія з'яўляюцца своеасаблівым сродкам фарміравання прафесійнай матывацыі, інтэлектуальнага развіцця, назапашвання прафесійных ведаў у адзінстве з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

агульнанавуковымі і прафесіянальнымі ўменнямі і навыкамі. Пацвярджэннем можа быць самастойная работа студэнтаў спецыялізацыі ў галіне бібліяграфічнай падрыхтоўкі па тэме "Методыка складання бібліяграфічных дапаможнікаў". З асноўнымі этапамі гэтай працы студэнты знаёмяцца пры вывучэнні курса "Арганізацыя і тэхналогія бібліятэчнай дзейнасці", а пры вывучэнні курса "Бібліяграфія літаратуры для дзяцей і юнацтва" яе карысна ўзбагаціць спецыяльнымі творчымі заданнямі па вызначэнні кола дзіцячай літаратуры (мастацкай і навукова-пазнавальнай) для пэўнага ўзросту, яе жанравага складу, асаблівасцей успрымання дзецьмі розных узроставых груп. Выкананне дадзеных заданняў самастойна магчыма на падставе ведаў, уменняў і навыкаў, атрыманых студэнтамі пры вывучэнні курсаў "Арганізацыя і тэхналогія бібліятэчнай дзейнасці", "Сусветная дзіцячая літаратура", "Бібліяграфія літаратуры для дзяцей і юнацтва", "Дзіцячае чытачазнаўства", "Псіхалогія дзіцячага і юнацкага чытання", "Навукова-пазнавальная літаратура для дзяцей і юнацтва".

У працэсе арганізацыі самастойнай работы студэнтаў выкладчыкі ставяць мэту навучыць будучых спецыялістаў самастойна набываць і паглыбляць свае веды, сфарміраваць у іх стойкія матывы і пазнавальныя інтарэсы. Менавіта пазнавальная цікавасць актывізуе пазнавальную дзейнасць і псіхафізічныя працэсы, якія ляжаць у аснове творчай, пошукавай, даследчай работы (А.М.Лявонцьеў).

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў павінна грунтавацца на педагогіцы супрацоўніцтва. Яна прадугледжвае пераход да суб'ект-суб'ектнай педагагічнай парадыгмы, асноўнымі прынцыпамі здзяйснення якой з'яўляюцца прынцыпы супрацоўніцтва, сукіравання і самакіравання студэнтаў. Яны дазваляюць рэалізаваць навучальную, выхаваўчую і развіццёвую функцыі навучання ў іх адзінстве.

Рэзультатыўнасць самастойнай дзейнасці залежыць таксама ад эмацыянальных адносін да яе, што ў значнай ступені абумоў-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лена педагагічным майстэрствам выкладчыка. Вядома, што эмоцыі актывізуюць псіхічную дзейнасць, у тым ліку ўплываюць на актывізацыю памяці, мыслення, уяўлення.

Самастойная работа патрабуе дыферэнцыяцыі, якая можа структуравацца, напрыклад, на падставе паспяховасці студэнтаў. Такі падыход дазваляе падтрымліваць у студэнтаў пазнавальную цікавасць і развіваць станоўчую матывацыю вучэбнай дзейнасці. Выкарыстоўваючы педагогіку супрацоўніцтва, выкладчык можа дасягнуць паступовага перамяшчэння студэнтаў са слабейшых груп у мацнейшыя.

Зместам самастойнай работы з'яўляюцца ўсе віды актыўнай вучэбнай і навуковай дзейнасці, якія патрабуюць самастойных пошукаў. Развіццё творчай актыўнасці студэнтаў у працэсе самастойнай работы прадугледжвае пошук новых формаў і метадаў яе арганізацыі. Для студэнтаў спецыялізацыі “бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і юнацтва” яна ўяўляе сабой розныя віды індывідуальнай і калектыўнай дзейнасці ў час аўдыторных і пазааўдыторных заняткаў пад кіраўніцтвам выкладчыка ці без непасрэднага яго ўдзелу. Пры індывідуалізацыі самастойнай работы студэнтаў выкладчыкі імкнуцца вызначыць іх псіхолага-педагагічныя асаблівасці з мэтай стварэння аптымальных умоў для творчага развіцця асобы будучага спецыяліста. Пры гэтым мэтазгодна выкарыстоўваць індывідуальна-творчы падыход, асноўнае прызначэнне якога – выяўляць і развіваць творчыя магчымасці студэнта, ствараць умовы для яго самарэалізацыі, аказваць уздзеянне на развіццё матывацыі дзейнасці. Пазааўдыторная індывідуальная самастойная работа студэнтаў накіравана на вывучэнне і аналіз найбольш каштоўных выданняў сусветнай дзіцячай літаратуры, у тым ліку і беларускай, якія сведчаць аб яе высокай духоўнасці і гуманістычнай накіраванасці. Студэнты вывучаюць навуковы даведачны апарат выданняў, канкрэтныя крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі, як традыцыйныя, так і электронныя, а таксама адметнасці бібліяграфічнай практычнай дзейнасці дзіцячых бібліятэк. Самастойная работа ў гэтым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

БІБЛІЯТЭКА

кірунку звязана з пэўнымі практычнымі заданнямі, якія выконваюцца студэнтамі ў розных тыпах бібліятэк, што абслугоўваюць дзяцей, напрыклад: стварэнне фрагментаў аўтарскіх праграм, сцэнарыяў, распрацоўка краязнаўчых, экалагічных урокаў і вандровак, удзел у стварэнні электронных прадуктаў, аналіз сайтаў буйнейшых бібліятэк свету і інш.

Калектыўная пазааўдыторная самастойная работа студэнтаў спецыялізацыі прадугледжвае выкананне распрацаваных выкладчыкамі заданняў (стварэнне картатэк перадавога вопыту бібліяграфічнай дзейнасці дзіцячых бібліятэк, параўнальны аналіз дзейнасці выдавецтваў Беларусі па выпуску дзіцячай літаратуры, вывучэнне бібліяграфічных патрэбнасцей канкрэтных чытацкіх груп; падрыхтоўка да розных мерапрыемстваў і інш.). Пры выкананні такіх заданняў студэнты маюць магчымасць праверыць свае веды, уменні і навыкі, упэўніцца, наколькі валодаюць педагагічнымі ўменнямі, якія выяўляюцца ў выхаваўчым праектаванні асобы чытача, ва ўменні прагназіраваць тыя ці іншыя якасці выхаванца.

Калектыўная аўдыторная самастойная работа студэнтаў уключае выкананне пошукавых заданняў на падставе традыцыйных крыніц і Internet-рэсурсаў, мадэляванне канкрэтных вытворчых сітуацый, правядзенне дзелавых гульняў і інш. У пераважнай большасці самастойная работа выконваецца з выкарыстаннем дыдактычных матэрыялаў.

Разнастайныя формы кантролю самастойнай работы студэнтаў спрыяюць яе якаснаму выкананню. Кантроль здзяйсняецца ў наступных формах: франтальнае міні-апытанне па раздзелах курса (на лекцыях, семінарах), праверка канспектаў, рэфератаў, дзённікаў чытання, тэставых заданняў, вынікаў выканання пошукавых заданняў, кантрольных работ, аналіз распрацаваных сцэнарыяў, заслухоўванне выступленняў на семінарах, гутаркі па пэўных тэмах курсаў, правядзенне калёквіумаў, абарона курсавых і дыпломных работ.

Адным з важнейшых кірункаў павышэння эфектыўнасці самастойнай работы студэнтаў з'яўляецца яе метадычнае забеспя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чэнне (з боку выкладчыка), а таксама магчымасць карыстацца разнастайнымі навукова-тэарэтычнымі, вучэбна-метадычнымі матэрыяламі не толькі айчыннымі, але і іншых краін. Важнымі тут з'яўляюцца і матэрыялы аб практычнай дзейнасці бібліятэк. Сёння выкладчыкамі распрацаваны і выдадзены матэрыялы ў дапамогу самастойнай рабоце студэнтаў.

У мэтах далейшага ўдасканальвання арганізацыі і зместу самастойнай работы студэнтаў патрабуюцца далейшае распрацоўка і ўкараненне новых формаў і метадаў кантролю за яе арганізацыяй і правядзеннем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ